# НАЦЫЯНАЛЬНЫ АРХІЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Інфармацыйны ліст

23 мая 2024 г. у Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь (пр-т Незалежнасці, 116, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь) адбудзецца **ІІІ Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Архіўны дыялог. Да 100-годдзя Першай усебеларускай канферэнцыі архіўных работнікаў»**. Данная міжнародная камунікацыйная пляцоўка адкрывае магчымасці для дыялогу і плённага абмену вопытам паміж архівістамі і даследчыкамі, прадстаўнікамі органаў дзяржаўнай улады, навукі, сфер адукацыі і культуры, грамадскіх аб'яднанняў.

## Праблемнае поле канферэнцыі

- Уплыў архіўных канферэнцый на развіццё архіўнай справы на Беларусі.
- Пытанні выкарыстання, захавання і ўліку дакументаў партыйнага комплекса (да 95-годдзя Цэнтральнага партыйнага архіва КПБ).
- Археаграфія і публікацыя дакументаў ХХ стагоддзя.
- Крыніцазнаўчы патэнцыял архіўных дакументаў па навейшай гісторыі Беларусі і дзяржаў постсавецкай прасторы.
- Унёсак архівістаў у захаванне, выкарыстанне і папулярызацыю гістарычнай спадчыны Беларусі.
- Архіўная справа на Беларусі ў ХХ—ХХІ стст.: гісторыя, методыка, практыка.

**Формы ўдзелу ў канферэнцыі — вочная, завочная, анлайн, стэндавы даклад, відэадаклад. Працоўныя мовы — беларуская і руская.**

**Па выніках канферэнцыі плануецца выданне зборніка матэрыялаў. Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору заявак на ўдзел у канферэнцыі і публікацыю матэрыялаў. Аўтары артыкулаў нясуць поўную адказнасць за арыгінальнасць і дакладнасць прадстаўляемых матэрыялаў.**

## Парадак прадстаўлення матэрыялаў

Для ўдзелу ў канферэнцыі неабходна да **30 красавіка 2024 г.** накіраваць у арганізацыйны камітэт заяўку (форма дадаецца). У выніку станоўчага разгляду заяўкі арганізацыйны камітэт у тэрмін да 20 мая 2024 г. накіруе паведамленне і запрашэнне для ўдзелу ў мерапрыемстве. Даклады (патрабаванні абазначаны ніжэй) неабходна прадставіць да 1 верасня 2024 г.

**Праезд, пражыванне і іншыя выдаткі ўдзельнікаў — за кошт камандзіруючай арганізацыі.**

**Студэнтам для удзелу ў канферэнцыі неабходна прадставіць водгук навуковага кіраўніка на даклад.**

**Заяўку і матэрыялы перасылаць ва ўказаныя тэрміны на электронны адрас:** op@narb.by

## Кантактныя дадзеныя

Пр-т Незалежнасці, 116, 220114, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, каб. 2022, аддзел публікацый ДУ «Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь»; электронная пошта: op@narb.by

Каардынатары канферэнцыі:
Агеенка Таццяна Мікалаеўна (тэл. прац.: 8(017) 272 05 15);
Вішнеўскі Ілля Аляксеевіч (тэл. прац.: 8(017) 374 59 14);
Кулінок Святаслаў Валянцінавіч (тэл. прац.: 8(017) 374 59 14).

*Дадатак 1*

**Заяўка на ўдзел у III Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Архіўны дыялог. Да 100-годдзя Першай усебеларускай канферэнцыі архіўных работнікаў »**

| | | |
|---|---|---|
| 1. | Прозвішча, імя, імя па бацьку (цалкам) | |
| 2. | Месца працы: пасада, падраздзяленне, поўнае найменне арганізацыі | |
| 3. | Вучоная ступень, званне | |
| 4. | E-mail, кантактны тэлефон | |
| 5. | Тэма даклада | |
| 6. | Форма ўдзелу: вочная/завочная/ анлайн/ стэндавы даклад/відэадаклад | |
| 7. | Неабходнасць тэхнічных сродкаў | |
| 8. | Пажаданні | |

## Правілы афармлення матэрыялаў

Файл у фармаце Microsoft Word (.doc, .docx, .rtf). Назва файла па форме: Прозвішча аўтара_Першыя два словы з назвы. Напрыклад: Новікаў_Крыніцазнаўчы патэнцыял.doc.

Гарнітура Times New Roman, кегль 12. Інтэрвал адзінарны. Выраўноўванне па шырыні. Палі: левае — 2 см, правае — 1,5 см, верхняе і ніжняе — 2 см. Водступ абзаца — 1 см.

Файл павінен утрымліваць наступныя кампаненты:

1) Імя, імя па бацьку, прозвішча — выраўноўванне па правым краі, курсіў.

2) Месца працы — выраўноўванне па правым краі, курсіў.

3) Праз радок назва артыкула — выраўноўванне па цэнтру, паўтлусты шрыфт, вялікія літары.

4) Праз радок асноўны тэкст артыкула аб'ёмам **да 20 тыс. знакаў** з прабеламі і зноскамі.

5) Спіс выкарыстаных крыніц афармляецца пасля асноўнага тэксту ў алфавітным парадку, бібліяграфічнае апісанне — у адпаведнасці з патрабаваннямі ВАК Рэспублікі Беларусь. Спасылкі ў тэксце даюцца ў квадратных дужках [1, арк. 13].

## Узор афармлення тэксту

*С.Я. Новікаў*
*УА «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт»*

**КРЫНІЦАЗНАЎЧЫ ПАТЭНЦЫЯЛ НЯМЕЦКІХ ТРАФЕЙНЫХ ДАКУМЕНТАЎ НАРБ (НА МАТЭРЫЯЛАХ КАЛЕКЦЫІ «АЛЕКСАНДРЫЙСКІЯ МІКРАФІЛЬМЫ»)**

Сёння, калі ў нашай краіне набывае развіццё тэндэнцыя па актыўным ўвядзенні ў навуковы зварот новых дакументальных крыніц [1, арк. 13].

## Узор афармлення літаратуры

**Крыніцы і літаратура**

1. Гернович, Т.Д. Первые нормативные акты об архивах БССР (начало 1920-х гг.) / Т.Д. Гернович // Беларускія архівы на мяжы тысячагоддзяў: здабыткі і страты: матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 80-годдзю Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (Мінск, 28 чэрвеня 2018 г.) / рэдкал. : В.І. Кураш (старшыня) [і інш.]. — Мінск : БелНДІДАС, 2019. — С. 37—48.
2. Дыла, Я. Скарбы творчасьці Максіма Багдановіча / Я. Дыла // Савецкая Беларусь. — 1923. — № 134. — С. 1.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 1274.
4. НАРБ. — Ф. 249. Воп. 1. Спр. 11.
5. Первая всебелорусская конференция архивных работников Беларуси 12—15 мая 1924 г. Документы и материалы / сост. М.Ф. Шумейко. — Минск : БелНИИДАД, 1999. — 148 с.